## Тэма 10.2 Міжнародныя адносіны ў 70-я – пачатку 90-х гг. ХХ ст.

1. Эпоха «разрадкі» ў міжнародных адносінах: прычыны, змест, вынікі.
2. Абвастрэнне міжнародных адносін у канцы 1970-х – першай палове 1980-х гг.
3. Змякчэнне напружанасці ў міжнародных адносінах у другой палове 1980-х гг.
4 Заканчэнне "халоднай вайны".

### Літаратура


Лазько, Р. Р. Навейшая гісторыя краін Еўропы і Амерыкі 1945-1999 гг. Вуч. дап. / Р. Р. Лазько– Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2000. – 120 с. (ГДУ)

Пономарев, М.В. История стран Европы и Америки в Новейшее время /М.В. Пономарев. – М.: Проспект, 2010. – 416 с. (Электр.)

Пленков, О. Ю. Новейшая история стран Европы и Америки / О. Ю. Пленков. – М.: Юрайт, 2016. – 398 с. (ГДУ)

Кузьмина, О. В. История новейшего времени / О. В. Кузьмина, Ю. Н. Ушаков. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – 400 с. (ГДУ)

Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. В 3. ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М.В.Пономарева. – М.: Гуманитар. Изд. Центр «Владос», 2001. – Ч. 2, 3. – 336 с. (Электр).

История новейшего времени стран Европы и Америки. 1945–2000 гг. / Под ред.Л. С. Белоусова, Е. Ф. Язькова и др. – М.: Простор, 2003. – 480 с.


**1.** Перыяд канца 1960-х – 1970-я гг. характарызаваўся змяншэннем напружанасці на міжнароднай арэне і ўвайшоў у гісторыю яе перыяд разрадкі. Змяншэнне напружанасці ў адносінах паміж Усходам і Захадам было ваклікана некалькімі прычынамі. Лідары вядучых дзяржаў свету асэнсавалі пагрозу гібелі чалавецтва ў выпадку ўзнікнення ядзернай вайны. А ва ўмовах вострай канфрантацыі яна магла пачацца і выпадкова. Абодва бакі былі зацікаўлены ў наладжванні эканамічнага супрацоўніцтва. А гэта патрабавала паляпшэння адносін і ў палітычнай сферы. Высветлілася, што вострая канфрантацыя на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў не дала перавагі ні аднаму з бакоў. Трэба было спыніць гонку ўзбраенняў, якая ляжала цяжарам на бюджэтах большасці краін. У нарошчванні ядзерных патэнцыялаў быў даўно пераадолены прынцып разумнай дастатковасці. Архітэктар разрадкі з амерыканскага боку Генры Кісінджэр лічыў, што імкнуцца дабіцца ваеннай перавагі над СССР не мае сэнсу. Гэта не нясе стратыгічных выгод. Для СССР адным з матываў павароту да паляпшэння адносін з Захадам стала рэзкае абвастрэнне адносін з Кітаем.

Першыя прыкметы змягчэння напружанасці на міжнароднай арэне сталі праяўляцца ў хуткім часе пасля вырашэння Карыбскага крызісу. 5 жніўня 1963 г. СССР, Вялікабрытанія і ЗША падпісалі дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, космасе і пад вадой. Гэта было першае буйное міжнароднае пагадненне, нацэленае на абмежаванне гонкі ўбраенняў. У кастрычніку 1963 г. СССР і ЗША дамовіліся аб невывадзе на касмічную арбіту аб’ектаў з ядзернай зброяй. 1 ліпеня 1968 г. быў адкрыты

да падпісання, а з 5 сакавіка 1970 г. уступіў у сілу Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Ён забараняў вытварчасць і набыццё ядзернай зброі неядзернымі дзяржавамі, перадачу ім ядзернай зброі. Статус ядзерных дзяржаў па дагавору атрымалі толькі СССР, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя і Кітай. Да дагавора ў першыя гады далучыліся каля 100 дзяржаў.

У сакавіку 1969 г. краіны Варшаўскага дагавора звярнуліся з прапановай прыступіць да непасрэднай падрыхтоўкі агульнаеўрапейскай нарады па бяспеццы з удзелам усіх еўрапейскіх краін і ЗША і Канады. Гэтыя прапановы знайшлі водгук у заходніх краін, чыя палітыкі ў гэты час мянялася. Прэзідэнт Францыі Ш. дэ Голь прадпрыняў крокі да паляпшэння адносін з СССР. Канцлер ФРГ В. Брант абвясціў "новую ўсходнюю палітыку", якая адкрывала шлях да нармалізацыі адносін ФРГ з сацыялістычнымі краінамі. ФРГ у рамках "новай усходняй палітыкі" прызнала граніцы, якія ўсталяваліся ў выніку Другой сусветнай вайны, а таксама ГДР як суверэнную дзяржаву. У 1973 г. дзве германскія дзяржавы былі прыняты ў ААН. Прагрэс па германскаму пытанню абазначыўся і ў справе ўрэгулявання статуса Заходняга Берліна. У верасні 1971 г. было падпісана пагадненне СССР, ЗША, Францыі і Вялікабрытаніі аб статусе Заходняга Берліна. Чатыры дзяржавы дамовіліся не прымяняць сілу ці пагрозы сілай у раёне Заходняга Берліна, вырашаць усе спрэчкі толькі мірнымі сродкамі, забяспечыць нармальнае функцыянаванне камунікацый паміж Заходнім Берлінам і ФРГ, самі заходнія сектары атрымалі статус самастойнай адміністрацыйнай адзінкі (не частка ФРГ).

Асабліва важнае значэнне для змягчэння напружанасці на міжнароднай арэнне мела паляпшэнне савецка-амерыканскіх адносін. У маі 1972 г. адбыўся візіт Р. Ніксана ў СССР. 26 мая Р. Ніксан і Л. Брэжнеў падпісалі Часовае пагадненне аб некаторых мерах у вобласці абмежавання стратэгтчных узбраенняў (АСУ-1). У адпаведнасці з ім бакі ўзялі абавязацельства на працягу бліжэйшых 5 гадоў не павялічваць колькасць пускавых установак межкантынентальных балістычных ракет. Абмяжоўвалася і колькасць падводных лодак і пускавых ракетных установак на іх. Таксама быў падпісаны дагавор аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай абароны (СРА). Згодна яму кожны з бакоў мог стварыць толькі адну зону СРА радаусам 150 км. Такім чынам амаль уся тэрыторыя краіны аказвалася безабароннай перад ядзернай атакай праціўніка. Гэта станавілася фактарам, які прымушаў устрымлівацца ад прымянення ядзернай зброі. У маі 1972 г. быў падпісаны і дакумент "Асновы ўзаемаадносін паміж СССР і ЗША". У ім бакі абавязаліся зрабіць усё магчымае для прадухілення ядзернай вайны і ваенных канфліктаў. Абвяшчалася адмова ад прымянення сілы ці пагрозы сілай, ад усялякіх прывілеяў у міжнародных справах. У 1973 г. адбыўся візіт Л. Брэжнева ў ЗША. Там было падпісана савецка-амерыканскае пагадненне аб прадухіленні ядзернай вайны. У лістападзе 1974 г. у час сустрэчы Л. Брэжнева і Г. Форда ў Уладзівастоку была дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы новага дагавора аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў. Савецка-амерыканскія перамовы прывялі да падпісання ў 1979 г. у Жэневе

Дж. Картэрам і Л. Брэжневым новага дагавора аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (АСУ-2). Ён абмяжоўваў колькасць ядзерных баегаловак і стратэгічных сродкаў іх дастаўкі для кожнага з бакоў да 2250. Дагавор не быў ратыфікаваны сенатам ЗША, але бакі прытрымліваліся яго палажэнняў. Сімвалам паляпшэння савецка-амерыкакнскіх адносін стаў сумесны касмічны палёт у 1975 г. карблёў "Саюз" і "Апалон" і сустрэча на арбіце савецкіх і амерыканскіх касманаўтаў.

Свой уклад у разрадку міжнароднай напружанасці ўнесла ААН. У 1965 г. ААН выказалася за ліквідацыю ваенных баз на каланіяльных тэрыторыях. У снежні 1966 г. у ААН быў адобраны дагавор, які забараняў размяшчэнне ў космасе зброі масавага знішчэння і ваеннае выкарыстанне касмічных аб'ектаў.

Важнейшым элементам разрадкі стаў Хельсінкскі, ці Агульнаеўрапейскі працэс, праца Нарады па бяспеццы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ). Першы этап Нарады адбыўся ў ліпені 1973 г. у Хельсінкі. Тут сабраліся 33 міністра замежных спраў еўрапейскіх краін, а таксама ЗША і Канады. Другі этап нарады праходзіў у верасні 1973 г. у Хельсінкі і ў ліпені 1975 г. у Жэневе. Камісіі, якія працавалі па трох напрамках – палітычны, эканамічны, гуманітарны – падрыхтавалі выніковы дакумент. Заключны акт Нарады па бяспеццы і супрацоўніцтву ў Еўропе быў падпісаны ў Хельсінкі 1 жніўня 1975 г. Заключны акт зафіксаваў міжнародна-прававое прызнанне тых палітычных і тэрытарыяльных змен, якія адбыліся ў Еўропе ў выніку Другой сусветнай вайны. Ён абвясціў асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін паміж дзяржавамі: суверэнная роўнасць, павага праў, якія характэрны для суверэнных дзяржаў, непрымяненне сілы, ці пагрозы сілай, непарушнасць граніц, павага тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў, мірнае ўрэгуляванне спрэчак, неўмяшанне ў унутраныя справы, павага праў чалавека і асноўных свабод, раўнапраўе і права народаў вызначаць свой лёс, супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, добрасумленнае выкананне сваіх міжнародных абавязацельстваў. Намячалася значнае пашырэнне гуманітарных кантактаў, у тым ліку на асабістым узроўні, абменаў у вобласці культуры і адукацыі.

Таксама быў прыняты выніковы дакумент па мерах умацавання даверу і некаторых аспектах бяспекі і разбраення. Ён прадугледжваў папярэдняе ўведамленне аб буйных ваенных манеўрах, абмен назіральнікамі на ваенных вучэннях. Заключны акт меў на ўвазе рэгулярныя сустрэчы і перагаворы ў рамках Агульнаеўрапейскага працэсу.

Разрадка не прывяла да спынення лакальных ваенных канфліктаў. Да 1975 г. працягвалася вайна ў В'етнаме, вынікам якой стала ўсталяванне камуністычных рэжымаў не толькі на ўсёй тэрыторыі В'етнама, але і ў Лаосе і Камбоджы. З 1975 г. разгараўся канфлікт на Поўдні Афрыкі, у які былі ўцягнуты Ангола, Мазамбік (у іх усталяваліся прасавецкія рэжымы), Куба, якая накіравала свае войскі на дапамогу Анголе, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, якая імкнулася падавіць партызанскі рух у сваёй калоніі Намібіі і звергнуць прасавецкі ўрад у Анголе. У 1977–1978 гг. адбывалася вайна паміж Эфіопіяй і Самалі. Эфіопію падтрымлівалі СССР і Куба, якая накіравала ў

гэтую краіну свой вайсковы кантынгент. Самалі падтрымалі краіны Захаду. У снежні 1971 г. адбылася 3-я Інда-пакістанская вайна. Яна не была прамым выніккам супрацьстаяння паміж Усходам і Захадам, але сімпатыі СССР былі на баку Індыі, а ЗША – Пакістана. Так што разрадка не прывяла да спынення супрацьстаяння звышдзяржаў у Трэцім свеце.

**2.** На мяжы 1970-х – 1980-х гг. перыяд разрадкі заканчваецца, пачынаецца новае абвастрэнне “халоднай вайны”. Прычыны гэтага: 1) узаемны недавер паміж СССР і ЗША. Амерыканцы патрабавалі непасрэднага кантролю на месцы за выкананнем дагавораў па абмежаванні ўзбраенняў; 2) з’яўленне навейшых відаў узбраення, якое дало штуршок новаму этапу гонкі ўзбраенняў (ракеты СС-20 у СССР, ракеты “Першынг 2” і крылатые ракеты, падводныя лодкі “Трайдэнт” у ЗША); 3) пашырэнне савецкага ўплыву ў Трэцім свеце. У 1970-я гг. шэраг развіваючыхся краін заявілі аб выбары сацыялістычнай арыентацыі (Эфіопія, Ангола, Мазамбік, Нікарагуа, Грэнада). Значная частка амерыканскай эліты разглядала гэта як аслабленне пазіцый ЗША ў свеце і звязвала такі ход падзей з разрадкай; 4) увод савецкіх войск у Афганістан; 5) краіны Захаду і сацыялістычнага лагеру па-featureрознаму трактавалі палажэнні Заключнага акта НБСЕ. Сацыялістычныя краіны асноўны акцэнт рабілі на палажэнні, якія датычыліся суверэнітэту і неўмяшання ва ўнутраныя справа. Захад настойліва патрабаваў выканання палажэнняў, які прадугледжвалі абарону праў чалавека, развіццё гуманітарных кантактаў.

Курс на пераход да канфрантацыі з СССР знайшоў сваё адлюстраванне ў “дактрыне Картэра”. У пасланні кангрэсу ў студзені 1980 г. прэзідэнт абвясціў раён Персідскага заліва зонай амерыканскіх жыццёвых інтарэсаў. Каб абараніць гэтыя інтарэсы, ЗША заявілі аб гатоўнасці ўжыць любыя сродкі, уключаючы ўзброеныя сілы. У 1979 г. краіны НАТО прынялі рашэнне аб размяшчэнні ў Еўропе амерыканскіх ракет сярэдняй далёкасці “Першынг 2” і крылатых ракет у адказ на разгортванне савецкіх ракет СС-20. Адначасова з разгортваннем ракет сярэдняй далёкасці Захад прапанаваў СССР пачаць перамовы аб ліквідацыі гэтага класа ракет. Савецкае кіраўніцтва адхіліла гэтую прапанову, бо яна не закранала ядзерныя патэнцыялы Вялікабрытаніі і Францыі. У 1983 г. пачалося разгортванне ў Еўропе 572 амерыканскіх ракет. Вынікам стала рэзкае павелічэнне магчымасці ўзнікнення ядзернай вайны, у тым ліку і выпадкова. У адказ СССР разгарнуў ракеты з ядзернымі зарадамі ў ГДР і Чэхаславакіі, у марскіх акваторыях, якія прылягалі да ЗША. Дэманстрацыяй новага вітка канфрантацыі стаў байкот Захадам Алімпійскіх гульней у Маскве ў 1980 г. У адказ краіны савецкага блока байкатавалі Алімпійскія гульні 1984 г. у Сан-Францыска.

Прыход да ўлады адміністрацыі Р. Рэйгана прывёў да рэзкага ўзмацнення антысавецкага курсу ў знешняй палітыцы ЗША. 8 чэрвеня 1982 г. прэзідэнт ЗША выступіў у англійскім парламенце і заклікаў краіны Захаду да “крыжовага паходу” за свабоду. У 1981–1982 гг. ЗША ўвялі дадатковыя

абмежаванні на гандаль з СССР. Пасля таго, як савецкія сілы СПА ў савецкай паветранай прасторы збілі ў раёне Сахаліна пасажырскі самалёт Паўднёвай Карэі, Рэйган аб’явіў СССР “імперыяй зла”.

Адбылося рэзкае паскарэнне гонкі ўзбраенняў. ЗША ў 1982 г. адмовіліся ад перамоў аб забароне ядзерных выпрабаванняў і выйшлі з дагавора 1974 г. аб абмежаванні падземных ядзрных выпрабаванняў. Пачалі актыўна разгортвацца новыя сістэмы ўзбраенняў: самалёты “Стэлс” і Б-1, падводныя лодкі “Трайдэнт” з ядзернымі крылатымі ракетамі на борце. У 1983 г. прэзідэнт Р. Рэйган прыняў рашэнне аб работах па размяшчэнні ў космасе элементаў супрацьракетнай абароны – стратэгічная абарончая ініцыятыва (САІ). Р. Рэйган лічыў ваенную раўнавагу з СССР небяспечнай для ЗША і імкнуўся да дасягнення абсалютнай ваеннай перавагі.

Паварот да новага вітка “халоднай вайны” суправаджаўся рэгіянальнымі канфліктамі. Знешнепалітычная дактрына Рэйгана прадугледжвала выкарыстанне кіруемых рэгіянальных канфліктаў для аслаблення пазіцый СССР на міжнароднай арэне. Але ўжо не ўсе канфлікты ўпісваліся ў рамкі двухполюснага супрацьстаяння. Буйнейшым ваенным канфліктам 1980-х гг. стала Ірана-іракская вайна 1980–1988 гг., не звязаная напрамую з супрацьстаяннем паміж СССР і ЗША. Прычыны вайны: 1) тэрытарыяльная спрэчка паміж Іранам і Іракам; 2) імкненне кіраўніцтва Ірана распаўсюдзіць на іншыя краіны ісламскую рэвалюцыю; 3) імкненне Ірака захапіць спрэчныя радовішча нафты ў пагранічных раёнах. Канфлікт набыў шырокі міжнародны рэзананс, бо ствараў пагрозу пастаўкам нафты з зоны Персідскага заліва. ЗША і іншыя краіны НАТО накіравалі ў рэгіён баявыя караблі для суправаджэння танкнераў.

У 1982 г. адбылася Фалклендская вайна паміж Вялікабрытаніяй і Аргенцінай. Яна прадэманстравала рост уплыву Вялікабрытаніі і Захаду ў цэлым на міжнароднай арэнне. М. Тэтчэр актыўна падтрымлівала характэрны для неакансерватараў антыкамуністычны курс Р. Рэйгана. Іх палітыка была палітыкай рашучай канфрантацыі з савецкім блокам. У 1983 г. ЗША ажыццявілі інтэрвенцыю ў Грэнаду, якая трапіла ў залежнасць ад Кубы. Р. Рэйган прадставіў звяржэнне тут левага ўрада як буйны поспех у справе адкідвання камунізму. У рамках палітыкі адкідвання камунізму ЗША актыўна падтрымалі атрады контрас, якія ваявалі супраць пракамуністычнага ўрада сандзіністаў у Нікарагуа.

У 1980-я гг. апрацягваўся канфлікт на поўдні Афрыкі. У Намібіі, якая знаходзілася пад уладай ПАР, разгарнуўся партызанскі рух. Яго падтрымлівалі т. з. прыфрантавыя дзяржавы: Ангола, Мазамбік. ПАР і Паўднёвая Радэзія прадпрымалі ваенныя акцыі супраць Анголы і Мазамбіка. У баявых дзеяннях ўдзельнічалі кубінскія войскі. Толькі ў канцы 1980-х гг. пры пасрэдніцтве ААН была дасягнута дамоўленасць аб мірным урэгуляванні. У 1982 г. успыхнула Пятая араба-ізраільская, ці Першая ліванская вайна. Армія Ізраіля ўвайшла ў Ліван, каб нанесці ўдар па фарміраваннях Арганізацыі Вызвалення Палесціны. Яны базіраваліся ў Ліване і ажыццяўлялі атакі на паўночныя раёны Ізраіля. У канфлікт

умяшаліся сірыйскія войскі. ЗША падтрымалі ў дыламатычным і ваенна-тэхнічным плане Ізраіль, СССР – Сірыю.

Арэнай супрацьстаяння паміж СССР і Захадам стаў Афганістан. У снежні 1979 г. у Афганістан былі ўведзены савецкія войскі. ЗША, іншыя краіны Захаду, многія ісламскія краіны сталі аказваць вялікую дапамогу афганскім маджахедам. ЗША імкнуліся выкарыстаць вайну ў Афганістане, каб максімальна аслабіць СССР.

**3.** Паварот у бок змягчэння міжнароднай напружанасці звязаны з пачаткам перабудовы ў СССР і вылучэннем М. Гарбачовым канцэпцыі новага палітычнага мыслення. Яно мела на ўвазе адмову ад ідэі класавага супрацьстаяння дзвюх сістэм – капіталістычнай і сацыялістычнай. У савецкай палітыцы быў абвешчаны прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей (фактычна, выжывання чалавецтва), зроблены ўпор на палітычныя, а не ваенныя метады забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

Перамены ў СССР станоўча паўплывалі на характар савецка-амерыканскіх адносін, што мела ключавое значэнне для змяншэння напружанасці на міжнароднай арэне ў цэлым. З другога боку ў амерыканскім кангрэсе ўзмацнялася крытыка гонкі ўзбраенняў, якая вяла да росту дэфіцыту бюджэту і дзяржаўнага доўгу. У адміністрацыі Рэйгана адбыліся кадравыя змены, у выніку якіх пайшлі ў адстаўку найбольш ваяўніча настроеныя дзеячы Уайнберг, Кейсі. Прыйшлі на ключавыя пасады больш памяркоўныя дзеячы. Так, дзяржэпартамент узначаліў Джордж Шульц.

Савецка-амерыканскі дыялог на вышэйшым узроўні набыў рэгулярны характар. Пачынаючы з 1985 г. М. Гарбачоў і Р. Рэйган сустракаліся кожны год. Цэнтральная ўвага на перамовах надавалася спыненню гонкі ўзбраенняў, змяншэнню ўзроўня ядзернага супрацьстаяння. СССР вылучыў пакет прапаноў аб скарачэнні ядзерных узбраенняў. На сустрэчы ў Рэйк'явіку СССР і ЗША былі блізкія да падпісання пагаднення па стратэгічных узбраеннях і ракетах сярэдняй і меншай далёкасці. Але яно не адбылося, бо Р. Рэйган адмовіўся спыніць праграму САІ, на чым настойваў СССР як на ўмове падпісання пагаднення па ракетах. Пры гэтым бакі заявілі, што не будуць дабівацца ваеннай перавагі.

Пасля Рэйк'явіка СССР прапанаваў заключыць асобнае пагадненне па ракетах сярэдняй і меншай далёкасці. У снежні 1987 г. у Вашынгтоне адбылася чарговая сустрэча Р. Рэйгана і М. Гарбачова. Пад час яе быў падпісаны Дагавор аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці (РСМД). Ён прадугледжваў ліквідацыю савецкіх і амерыканскіх ракет, якія мелі далёкасць палёту ад 500 да 5500 км. Гэта азначала, што ў Еўропе больш не будзе амерыканскіх крылатых ракет і "Першынг 2". Дагавор не закранаў ядзерныя арсеналы Вялікабрытаніі і Францыі. Дамоўленасць была дасягнута на аснове т. з. "нулявога варыянта", які з самага пачатку прапаноўвалі краіны НАТО. У дагаворы РСМД быў прапісаны комплекс мер па кантролю за яго выкананнем. У тым ліку прадугледжвалася інспекцыя прадпрыемстваў, якія маглі выпускаць ракеты, як на тэрыторыі СССР і ЗША, так і іх саюзнікаў.

Значэнне Дагавора РСМД заключаецца ў тым, што гэта было пагадненне, якое ўпершыню ў гісторыі прадугледжвала скарачэнне ядзерных патэнцыялаў (каля 4 %), ліквідацыю цэлага класа ракетна-ядзернай зброі.

29 мая – 2 ліпеня 1988 г. адбыўся візіт Р. Рэйгана ў Маскву. Гэты візіт у гістарыяграфіі разглядаецаа як прэлюдзія да завяршэння "халоднай вайны". Былі дасягнуты дамоўленасці аб развіцці дыялога ў галіне праў чалавека і глабальных праблем сучаснасці. Узгоднены праект дагавора аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў. Р. Рэйган заявіў журналістам, што больш не лічыць СССР імперыяй зла.

Уступіўшы на пасаду прэзідэнта ў пачатку 1989 г. Джордж Буш (старэйшы) заявіў, што будзе прытрымлівацца палітыкі разрадкі. У снежні 1989 г. адбылася сустрэча М. Гарбачова і Дж. Буша на Мальце. На ёй бакі дасягнулі згоды аб распрацоўцы савецка-амерыканскага дагавора, які прадугледжваў скарачэнне стратэгічных узбраенняў бакоў на 50 %. Таксама была дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы дагавора паміж краінамі НАТО і АВД аб скарачэнні звычайных ўзбраенняў. 30 мая – 2 чэрвеня 1990 г. адбыўся візіт М. Гарбачова ў ЗША. Было падпісана 24 дакумента, якія датычыліся розных аспектаў савецка-амерыканскіх адносін. У тым ліку пагадненне аб знішчэнні і невытворчасці хімічнай зброі. У ліпені 1991 г. у Маскве быў падпісаны савецка-амерыканскі дагавор аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ 1) на 1/3. Кожнаму з бакоў заставалася па 1600 старэтэгічных носьбітаў ядзернай зброі і 6000 баязарадаў.

У другой палове 1980-х гг. актывізаваўся Агульнаеўрапейскі працэс. У сакавіку 1989 г. у Вене пачаліся перамовы 23 дзяржаў, якія ўваходзілі ў НАТО і АВД аб скарачэнні звычайных узбраенняў ад Атлантыкі да Урала. Распрацаваны на іх Дагавор аб абмежаванні ўзброеных сіл у Еўропе (ДАУСЕ) быў падпісаны ў Парыжы ў лістападзе 1990 г. У Парыжскай сустрэчы упершыню пасля Хельсінкі 1975 г. удзельнічалі кіраўнікі 32 дзяржаў Еўропы, ЗША і Канады. Падпісаны ў Парыжы выніковы дакумент Парыжская хартыя для новай Еўропы пацвердзіў вернасць палажэнням Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Было заяўлена аб завяршэнні эры канфрантацыі і раскола і пачатку эпохі дэмакратыі, міра і адзінства. У хартыі была раскрыта сутнасць дэмакратыі як формы праўлення, укзана на яе непарыўную сувязь з верхавенствам закона і павагай да асобы, былі сфармуляваны асноўныя правы і свабоды чалавека. Стваралася сістэма рэгулярных палітычных кансультацый на розных узроўнях. Такім чынам, Парыжская хартыя замацавала ліберальныя каштоўнасці як усеагульныя, якія падлягаюць міжнародным гарантыям.

Для разрадкі ў Еўропе важнейшае значэнне мела аб'яднанне Германіі. Менавіта адыход свету ад двухполюснага супрацьстаяння адкрыў шлях для дасягнення германскага адзінства. Міжнародны аспект аб'яднання Германіі быў урэгуляваны дагаворам "2+4" ад 12 верасня 1990 г. Адначасова з ім быў падпісаны Дагавор аб добрасуседстве, партнёрстве і супрацоўніцтве паміж СССР і ФРГ. У гэтых дакументах абвяшчался непарушнасць граніц, якія

склаліся пасля Другой сусветнай вайны. Германія заставалася ў НАТО, але ёй забаранялася мець зброю масавага знішчэння, і яна скарачала армію з 500 тыс да 370 тыс. СССР павінен быў вывесці свае войскі з Германіі да 1994 г. Новы міжнародны статус Германіі быў вызначаны і дакументам, які быў падпісаны міністрамі замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі ў Нью-Йорку 1 кастрычніка 1990 г. Ён спыняў дзеянне праў і адказнасці чатырох дзяржаў у дачыненні да Берліна і ўсёй Германіі. Аб'яднанне Германіі фактычна і юрыдычна падвяло рысу пад вынікамі Другой сусветнай вайны ў Еўропе. Пачаўся новы этап еўрапейскай палітыкі.

Змягчэнню міжнароднай напружанасці садзейнічала дзейнасць ААН. У 1984 г. Генаральная асамблея ААН прыняла рэзалюцыю супраць перанясення гонкі ўзбраенняў у космас. Генеральны сакратар ААН Перас дэ Куэльяр і прадстаўнікі ААН унеслі значны ўклад у ўрэгуляванне шэрагу міжнародных канфліктаў. З актыўным ўдзелам ААН была спынена Ірана-іракская вайна, урэгуляваны канфлікт на Поўдні Афрыкі.

Для змяншэння напружанасці на міжнароднай арэне важнае значэнне мела ўрэгуляванне сітуацыі вакол Афганістана. У красавіку 1988 г. было падпісана Жэнеўскае пагадненне па Афганістану. Яно прадугледжвала ўрэгуляванне адносін паміж Афганістанам і Пакістанам і вывад савецкіх войск з Афганістана. 15 лютага 1989 г. савецкія войскі цалкам пакінулі Афганістан, але гэта не прывяло да ўсталявання міру ў гэтай краіне.

Прыкладам узаемадзеяння СССР і ЗША ва ўмовах рэгіянальнага канфлікта ў новых умовах стаў Кувейцкі крызіс. СССР падтрымаў рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН, якія кваліфікавалі дзейнасць Ірака ў адносінах да Кувейта як крызіс і давалі права міжнародным сілам на правядзенне аперацыі з мэтай вызвалення Кувейта. Што і адбылося ў выніку аперацыі "Бура ў пустыні" ў пачатку 1991 г.

**4.** Тыя працэсы, якія адбываліся ў свеце на мяжы 1980-х – 1990-х гг., знаменавалі сабой завяршэнне "халоднай вайны". У якасці падзей, з якімі гісторыкі звязваюць завяршэнне "халоднай вайны", звычайна вызначаюць сустрэчу М. Грабачова і Дж. Буша на Мальце ў снежні 1989 г. Там М. Гарбачоў заявіў, што ЗША больш не з'яўляюцца ворагам СССР. Ён падкрэсліў важнасць амерыканскай прысутнасці ў Еўропе для забеспячэння бяспекі і стабільнасці на кантыненце. На Мальце былі дасягнуты прынцыповыя дамоўленасці адносна неабходнасці скарачэння як ядзерных, так і звычайных узбраенняў. Усё гэта азначала згортванне супрацьстаяння паміж звышдзржавамі. Акрамя таго на Мальце Гарбачоў фактычна прызнаў, што СССР, які сутыкнуўся з глыбокім унутраным крызісам, не можа больш канкурыраваць з ЗША на роўных у міжнародных справах. Гэта азначала пачатк распаду двухпалярнага свету.

Распад біпалярнай сістэмы звязаны і з дэмакратычнымі рэвалюцыямі, якія адбыліся ў краінах ЦПУЕ ў 1989–1990 гг. Перамога гэтых рэвалюцый азначала, што краіны рэгіёна адмаўляліся ад сацыялістычнай мадэлі развіцця. Адпаведна, гэта азначала развал сацыялістычнага лагера. Дадзеная

тэндэнцыя была канчаткова аформлена фактам ліквідацыі ў 1991 г. СЭУ і АВД. Былыя сацыялістычныя краіны абралі ў якасці асноўнага для сваёй знешней палітыкі еўраатлантычны вектар. СССР такім чынам застаўся без сацелітаў, што фактычна пазбаўляла яго стутсу звышдзяржавы. Канчатковая ліквідацыя біпалярнай сістэмы звязана з распадам СССР у канцы 1991 г., бо знікла адна з дзвюх звышдзяржаў.

Распад сацыялістычнага лагера азначаў і пераадоленне такога элемента “халоднай вайны”, як раскол Еўропы. Пераадоленне гэтага раскола знайшло адлюстраванне ў падпісанні Парыжскай хартыі для новай Еўропы 1990 г. Усе еўрапейскія дзяржавы прызналі лібіральныя дэмакратычныя каштоўнасці ў якасці агульных для іх. Так што падпісанне Парыжскай хартыі і Парыжскага пагаднення аб звычайных узбраеннях таксама падзея, якую можна разглядаць як знамянуючую заканчэнне “халоднай вайны”. Адным з найбольш яскравых сімвалаў расколу Еўропы і свету ў час “холоднай вайны” быў раскол Германіі. І адпаведна падзенне Бярлінскай сцяны і аб’яднанне Германіі яшчэ адна падзея, якая дазваляе гаварыць аб заканчэнні “халоднай вайны”.

Пераадоленне расколу Еўропы азначала, што знік яе падзел на сферы ўплыву. Дадзены падзел фактычна быў зафіксаваны ў дамоўленасцях “вялікай тройкі” на завяршальным этапе Другой сусветнай вайны. Гэта было адно з палажэнняў, якое характарызавала Ялцінскую сістэму міжнародных адносін. Да пачатку 1990-х гг. былі ўрэгуляваны наступствы Другой сусветнай вайны для Еўропы і, у прыватнасці, для Германіі. Завяршэнне “халоднай вайны” знаменавала сабою ліквідацыю Ялцінскай сістэмы міжнародных адносін.

Адной з важнейшых прыкмет “халоднай вайны” была гонка ўзбраенняў. Заключэнне дагавароў аб РСМД 1987 г., аб звычайных узбраеннях 1990 г., СНУ-1 1991 г. у значнай ступені спыніла гонку ўзбраенняў. Таму названыя пагадненні па скарачэнні ўзбраенняў мы маем падставы таксама характарызаваць як крокі на шляху да заканчэння “халаднай вайны”.

Многія гісторыкі важнай падзеяй, якая сімвалізуе сабой заканчэнне “халоднай вайны” лічаць Кувейцкі крызіс 1991 г. У час яго ўжо дакладна праявілася лідзіруючая роля ЗША ў міжнародных справах. СССР дзейнічаў у фарватары амерыканскай палітыкі. Дзве дзяржавы, якія звычайна супрацьстаялі адна другой, падтрымліваючы розныя бакі ў рэгіянальных канфліктах, у дадзеным выпадку выступілі з аднолькавых пазіцый.

Заканчэнне “халоднай вайны” адкрывала магчымасці для мірнага ўрэгулявання лакальных канфліктаў у Трэцім свеце. Прыкладам можа быць пагадненне аб урэгуляванні канфлікта на Поўдні Афрыкі, у выніку чаго спынілася ваеннае супрацьстаянне ПАР з суседнімі дзяржавамі, а Намібія атрымала незалежнасць. Бала дасягнута нацыянальная згода ў Кампучыі. Пры пасрэдніцтве СССР і ЗША пачаліся араба-ізраільскія перагаворы. 30 кастрычніка 1991 г. адкрылася Мадрыдская канферэнцыя па праблемах Блізкага Усходу пад сумесным старшынствам ЗША і СССР.

Завяршэнне “халоднай вайны” паставіла на парадак дня пытанне аб стварэнні новай сістэмы міжнародных адносін, якая заменіць Ялцінскую

сістэму і біпалярны свет. Важнейшым у такой сітуацыі была праблема, што сабой будзе прадстаўляць сабой новая сістэма бяспекі. Ранейшая стабільнасць на страху знікла разам з заканчэннем “халоднай вайны”. Узнікала пытанне аб новай ролі НАТО, аб рэфарамаванні ААН. Знікла ранейшая роля НАТО, якая заключалася ў супрацьстаянні савецкаму блоку. ААН стваралася па выніках Другой сусветнай вайны. У пачатку 1990-х гг. вынікі Другой сусветнай вайны былі ўжо пераадолены.